на ўраджай, на здароўе. На сенняшні дзень беларуская мова, адзенне, розныя атрыбуты становяцца больш папулярнымі, чым раней.

ЛІТАРАТУРА:

1. Кацар, М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар; навук. рэд. Я. М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1996. – 208 с.

# ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ ЯКУБА КОЛАСА

УА “Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”
Кухнавец А. А., студэнт 1 курса лячэбнага факультэта
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В. І.

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Янка Купала

Помніцца, раней, калі я была маленькай дзяўчынкай, праводзячы амаль усе святы разам са сваёй бабуляй, па яе загадзе я прыносіла любімыя нам зборнікі твораў. Тады я не ўмела чытаць і не ведала ні аўтара, ні назву зборнікаў. Вокладкі кніг здаваліся мне не вельмі прыгожымі, але вершы і творы, змешчаныя ў іх мне падабаліся. І вось седзячы каля печы бабуля чытала мне творы. Ох, як я любіла гэты прыгожы пявучы яе голас! І цяпер, калі я пасталела гэтыя ўспаміны, здаецца, назаўсёды застануцца ў маёй памяці і будуць нагадваць мне пра тыя бесклапотныя часіны жыцця.

Праз некаторы час, прыехаўшы ў вёску, я знайшла гэты зборнік і прачытала яго назву і аўтара. Гэта быў зборнік Якуба Коласа “Голас зямлі”. Імя гэтага аўтара канечне ж было мне знаёмым. Здаецца, што калі зараз выйсці на вуліцу і спытаць у простых прахожых, ці ведаюць яны Якуба Коласа, тыя без роздуму адкажуць і можа яшчэ дададуць свае пачуцці наконтага аўтара, а можа нехта і апынецца яго сваяком. І гэта не дзіва, бо жывём усе мы побач , таму што кожны беларус – гэта састаўная частка вялікай і дружнай сям’і. Усіх нас аб’ядноўвае адзінае месца жыхарства, агульная Бацькаўшчына, якую трэба любіць і аберагаць. І вось такія пісьменнікі сваімі творамі, звяртаннямі да народу сплачаюць яго, пакідаючь свайму народу асабістую “спадчыну”. ”Ёсць рэчы, у якія не паверыш пакуль не убачыш, але ёсць рэчы, якія не ўбачыш пакуль не паверыш”. Да апошняга тыпу рэчаў адносіцца спадчына, гэта таксама і літаратурная спадчына.

У 1906 годзе адбылося станаўлення Якуба Коласа і як паэта. У першым нумары газеты “Наша доля” ён друкуе верш “Наш родны край”.

Коласа абвінавачвалі ў ажыццяўленні праграмы Усерасійскага саюза настаўнікаў, скіраванай, на думку ўладаў, на падрыў грамадскага ладу Расійскай імперыі, а таксама ў складанні адозвы да настаўнікаў, якую не пісаў,



Репозиторий ГрГМУ

але сапраўднага аўтара не выдаў. У 1908 годзе ўлады ўзбудзілі справу за арганізацыю настаўніцкага з'езда, і Якуб Колас быў асуджаны на 3 гады астрога. Сябры, што заставаліся на волі, у 1910 годзе выдалі зборнік яго вершаў "Песні-жальбы". У савецкі час выдадзены кніга апавяданняў «Казкі жыцця».

У 1990 годзе ў вёсцы Пінкавічы запрацаваў музей Якуба Коласа пад кіраўніцтвам Івана Калошы. На адкрыцці прысутнічаў сын Коласа.Жыццё народа, увогуле, можна параўнаць з дрэвам. Дзе веткі - гэта тая, мінуўшчына, якая нам засталася нам у спадчыну, ствол – гэта шлях, які павінна прайсці мінулае, каб застацца ў сэрцах людей, пакінуць след у гісторыі, а карэнне – гэта ўжо і ёсць сучаснае. І каб сенішнія поспехі ў будучым сталі моцнымі веткамі дрэва, трэба абавязкова даглядаць за ім, стаяць гарой за яго, каб ніякія няўдачы не перашкодзілі сучаснаму застацца у гісторыі.

Вывучэннем жыцця і творчасці паэта займаецца адна з галін беларускай літаратурнай навукі — коласазнаўства.

1920-я гады заканчвае паэмы "Новая зямля" і "Сымон-музыка", у тым ліку стварае трылогію "На ростанях". Калі чытаеш знакамітую трылогію Якуба Коласа "На ростанях", то перад вачыма ўсплывае мой родны Пінск і палескія краявіды: "… дзе Піна падаецца ў бок зарэчных балот, вельмі добра відаць паўднёвая часць Пінска. Велізарны белы манастыр, збудаваны езуітамі ў шаснаццатым веку, і манастырскі будынак, дзе даўней жылі манахі, а цяпер змяшчаецца духоўнае вучылішча, узнімаюцца над роўняддзю балот, становячы самы крайні паўднёвы рог Пінска.

Зацятаю грознасцю і пануракю суровасцю вее ад гэтых старасвецкіх муроў, а манастыр мае выгляд непадкупнага вартаўніка аджытых рэлігійных традыцый старасветчыны…"

Асабліва гэта прыемна мне, пінчанцы. Нельга не адзначыць і той факт, што ў нас, на Піншчыне, у вёсцы Пінкавічы , працуе музей Якуба Коласа і ўстаноўлена мемарыяльная дошка. На адкрыцці прысутнічаў сын пісьменніка. Менавіта ў гэтай хаце жыў Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч з 1912 па 1915 год.

"Адысея беларускай літаратуры" менавіта, такую назву даюць паэме "Новая зямля" літаратурныя крытыкі. Якуб Колас даволі доўга клапаціўся напісаннем гэтай кнігі – аж дваццаць гадоў. І рабіў ён гэта не здарма, бо зараз гэта даволі вядомая паэма сусветнага ўзроўня, у якой удала пераплецяны аўтабіяграфічныя факты з простым жыццём і клопатамі сялян на ўлонні прыроды. Іван Навуменка назваў паэму "Біблія".

Прааналізуючы яго творчасць не цяжка заўважыць, што пэўнае месца займаюць вершы пра родны кут. Прыкладам таму служаць вершы "Мой родны кут, як ты мне мілы!...", "Родныя вобразы" і "О, край родны, край прыгожы!..". У іх аўтар паказвае мясцовасць, якую бачыў ён амаль кожны дзень, якая натхняла на напісанне новых твораў. Прырода – гэта не проста сад, у якім растуць дрэвы і кветкі, гэта эмацыянальны стан аўтара, праз які мы адчуваем яго любоў да Бацькаўшчыны. Значную частку яго твораў займаюць творы, прысвечыная самым маленькім жыхарам краіны – дзецям. Аўтар развівае ў іх пачуццё выдатнага, каб вырасціць пакаленне вядомых сучасных пісьменнікаў, пачынаючы з простых і павучальных твораў, такіх як: "На рэчцы зімою", "Янка

малюе”, “Хмарка” і іншых. Апавядаючы пра дзяцей нельга не ўспомніць кнігу “Другое чытанне для дзяцей беларусаў”, прызначаную для вучняў другага класа. Кніга павінна спрыяць навучанню іх роднай мове, пашырыць жыццёвы кругагляд.

# ТАПАНІМІКА ГРОДЗЕНСКАГА РЭГІЕНА

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Рэкець А. А., студэнт 5 курса медыка-псіхалагічнага факультэта
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В. І.

Тапонімы – разрад оніма, уласнае імя, якое азначае назву прыроднага аб'екта на Зямлі ці аб'екта, створанага чалавекам на Зямлі. Тапонімы вывучаюцца навукай тапанімікай, якая з'яўляецца раздзелам анамастыкі.

Сярод тапонімаў вылучаюцца розныя класы, такія, як:

Аронімы – назвы паднятых формаў рэльефа (гор, хрыбтоў, вяршынь, узгоркаў);

- Спелеонімы – назвы прыродных падземных утварэнняў;
- Харонімы – назвы любых тэрыторый, абласцей, раёнаў;
- Урбанонімы – назвы ўнутрыгарадскіх аб'ектаў;
- Агаронімы – назвы плошчаў;
- Гадонімы – назвы вуліц;
- Драмонімы – назвы шляхоў паведамлення;
- Айконімы – назвы населенных месцаў;
- Асцінонімы – назвы гарадоў;
- Камонімы – назвы сельскіх паселішчаў;
- Гідронімы – геаграфічныя назвы водных аб'ектаў, у тым ліку:

Гелонімы – назвы балот, забалочаных мясцін;

Лімнонімы – назвы азёр;

Акіянонімы – назвы акіянаў;

Пелагонімы – назвы мораў;

Патамонімы – назвы рэк;

- Інсулонімы – назвы астравоў;
- Аграонімы – назвы выраблены зямельных надзелаў;
- Дрымонімы – назвы лясоў, пушчаў, бароў.

З лінгвістычнага пункту гледжання можна адзначыць тры задачы, якія выконваюць гадонімы:

1) дыферэнцыйная – абмежаванне аднаго аб'екта ад іншых;
2) семантычная – паведамленні пра гэты аб'ект;
3) семіятычная – фіксацыі сацыяльна значных сэнсаў. Гаданімія сфарміравалася як прынцыпова семантычная сістэма: найменні вуліц інфар-



Репозиторий ГрГМУ